СУСТРЭЧЫ



УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА СА СВАЙГО

ШЧУЧЫН. 21 кастрычніка сваю кнігу, зборнік крытычных артыкулаў «Масты і берагі» тут прэзентаваў мясцовым аматарам літаратуры член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.



Паслухаць госця і пазнаёміцца з яго новай кнігай у Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі сабраліся прадстаўнікі розных пакаленняў – ветэраны працы і навучэнская моладзь, работнікі адукацыі і культуры, грамадскія актывісты, людзі неабыякавыя да мастацтва. Як адзначыў Дзмітрый Мікалаевіч, мэта кнігі, якая сёлета была адзначана найвышэйшай літаратурнай узнагародай краіны, Нацыянальнай літаратурнай прэміяй Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства», – ліквідаваць недахоп ведаў аб сучаснай літаратуры Гродзенскай вобласці, а мэта яе прэзентацыі – раскрыць унутраны свет сучаснага айчыннага пісьменніка, каб прадэманстраваць, наколькі ён блізкі і зразумелы сучаснаму чытачу.

Пісьменнік расказаў аб рабоце над выданнем, аб супрацоўніцтве з Выдавецкім домам «Звязда» (Мінск), якое для яго толькі пачынаецца, і падзякаваў за падтрымку Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі, якая набыла партыю кніг «Масты і берагі» для свайго фонду. Кніга-летапіс, кніга-запавет, кніга-адлюстраванне запрашае сучасніка пагрузіцца ў атмасферу творчай майстэрні літаратара, знаёміць з рознымі этапамі творчага шляху і набыткамі многіх калег аўтара па Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, аддае даніну памяці тым творцам, якіх ужо няма з намі, аналізуе вынікі некаторых абласных літаратурных конкурсаў, завастрае ўвагу на творчым патэнцыяле пішучай моладзі. На прэзентацыі прысутнічала

ўдзельніца абласнога семінару маладых літаратараў Гродзеншчыны і І Рэспубліканскага форуму маладых літаратараў, аўтар кніг для дзяцей Алена Запаснік.



Жыццёвым і творчым крэда Дзмітрыя Радзівончыка з'яўляецца крылаты выраз «Усё пачынаецца са свайго». Таму ў яго кнігі «Масты і берагі» чуецца пэўнае сацыяльнае гучанне. Неабходна падкрэсліць, спектр закранутых праблем, той інфарматыўны і эмацыйны пасыл, які аўтарам зборніка крытычных артыкулаў быў адрасаваны аўдыторыі, слухачы ўспрынялі з разуменнем і зацікаўленасцю. Прэзентацыя кнігі скончылася паэтычным блокам ад Дзмітрыя Радзівончыка, прысвечаным Году беларускай жанчыны. Песенныя сувеніры з юнацтва пісьменніка сталі прыемным бонусам, падарункам шчучынцам за сяброўскі, цёплы прыём, а ён быў менавіта такім. У фінале мерапрыемства дырэктар Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі Аляксандра Мікалаеўна Янкоўская назвала госця верным сябрам раённай установы культуры і ўручыла букет кветак. Візіт гродзенскага літаратара ў Шчучын завяршылі прагулка па горадзе і фотасесія.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ


На фота: член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык у Шчучыне з нагоды прэзентацыі кнігі, зборніка крытычных артыкулаў «Масты і берагі». 21 кастрычніка 2026 года.






STboard
Поиск
ДЫМ БЕЗ ОГНЯ
БАГДАНОВІЧА ВЕЧНАЯ ЗОРКА
РЕКА БЕЗБЕРЕЖНАЯ
РЕКА БЕЗБЕРЕЖНАЯ


Дмітрый Радзівончык







А. М. Янкоўская і
Д. М. Радзівончык






Дзмітрый Радзівончык і Алена Запаснік



Пасля прэзентацыі





Дзмітрый Радзівончык: прывітанне са Шчучына








КАЛЕГІУМ
ОРДЭНА ПІЯРАЎ




ШУЧИН





Ля помніка Цётцы

Фота Андрэя Абрамава

www.pisateli.by